партый, калі Купала відавочна прайграваў, ён пасля чарговага ўдалага ходу свайго апанента ўсклікнуў: «Ах ты, мужык!». Колас не застаўся ў даўгу і адказаў: «А ты – шляхцюк!». Завязалася бойка, усе фігуры былі змецены з шахматнай дошкі. Так Янка Купала выратаваўся ад паразы.


ЛІТАРАТУРА:

1. Зуева, В. У. Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання / В. У. Зуева [і інш.]. – М., 2021. – с. 263
2. Радкович, А. И. Особенности интимной лирики Якуба Колоса [Электронный ресурс] / А. И. Радкович. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/272944/1. – Дата доступа: 08.10.2021.
3. Климец, А. И. Пясняр долі народнай [Электронный ресурс] / А. И. Климец. – Режим доступа: http://yakubkolas.ru/pyasnyar-doli-narodnai. – Дата доступа: 08.10.2021


Репозиторий ГрГМУ

# РАЗВІЦЦЁ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ НА АСНОВЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ


**Прэдка В. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Янкі Купалы

Навуковы кіраўнік – к. філал. н, дацэнт Лапкоўская А. М.


Чытанне займае важнае месца ў жыцці кожнага культурнага чалавека і з'яўляецца адным з галоўных прадметаў для вывучэння на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі, яно прызвана абудзіць у вучняў цікавасць да кніг, закласці асновы культуры чытання, далучыць да агульначалавечых і нацыянальных духоўных каштоўнасцей. Камп'ютарныя і іншыя інфармацыйныя тэхналогіі знізілі цікавасць сучаснага чытача да кнігі, здольнай узбагаціць унутраны свет чалавека, даць веды пра жыццё і свет, развіць самастойнае мысленне і даставіць чытачу мастацкую асалоду.

Кожны вучань можа мець поспех у тым ці іншым накірунку вучэбнай ці практычнай дзейнасці. І вядома ж, хочацца бачыць іх вучнямі, якія ўмеюць вучыцца, здабываць і перапрацоўваць атрыманую інфармацыю з розных крыніц. У сучаснай метадычнай літаратуры праблема фарміравання і развіцця чытацкіх уменняў на аснове нацыянальных культурных традыцый у вучняў на ўроках літаратурнага чытання яшчэ не знайшла належнага асвятлення. Актуальнасць выбранай тэмы даследавання абумоўлена тым, што выкарыстанне нацыянальных традыцый у навучанні школьнікаў дае магчымасць для далучэння дзяцей да народнай культуры, развівае ў вучняў уменне прымяняць прыказкі, прымаўкі, загадкі ў зносінах, фарміруе ў дзяцей культурна-этнічныя веды.

Варта адзначыць, што нацыянальныя культурныя традыцыі займаюць нязначнае месца ў сучасных праграмах пачатковай школы, хаця яны

змяшчаюць значны патэнцыял для развіцця чытацкіх уменняў, а таксама маральных якасцей вучня.

Народныя традыцыі з’яўляюцца састаўной і неад’емнай часткай агульнай духоўнай культуры народа. Далучэнне малодшых школьнікаў да культурных традыцый спрыяе пазнаванню і ўмацаванню самасвядомасці, якая з’яўляецца важнай для захавання самабытнасці грамадства, захавання гісторыі і вызначэння будучыні народа [1, с. 89].

Азнаямленне з нацыянальнай культурай пачынаецца яшчэ з дашкольнага ўзросту. На І ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучняў працягваюць знаёміць з традыцыямі беларускага народа, дзеці вучацца ўжо самі выдзяляць пэўны сэнс з твораў беларускай народнай творчасці. Таму неабходна шырокае і актыўнае выкарыстанне ўсіх відаў нацыянальнай культурнай творчасці. Знаёмячыся з прымаўкамі, загадкамі, казкамі вучні далучаюцца да маральных агульначалавечых каштоўнасцей. У прыказках і прымаўках абмяркоўваюцца розныя жыццёвыя пазіцыі, высмейваюцца недахопы, усхваляюцца станоўчыя якасці людзей. Асабліва вялікае месца ў творах беларускай народнай творчасці займае паважлівае стаўленне да працы і да чалавека, які працуе на карысць свайго роднага краю. Дзякуючы гэтаму нацыянальная культурная творчасць з’яўляецца самай багатай крыніцай пазнавальнага і маральнага развіцця дзяцей.

Працуючы над творамі нацыянальнай культуры вучні фарміруюць спецыяльныя чытацкія ўменні. Літаратурнае чытанне ўяўляе сабой базавы гуманітарны прадмет у пачатковай школе, з дапамогай якога вырашаюцца не толькі прадметныя задачы, але і задачы, агульныя для ўсіх прадметаў гуманітарнага развіцця дзіцяці ў малодшай школе. Чытацкія ўменні Беларуская педагагічная энцыклапедыя тлумачыць як уменні, звязаныя з успрыманнем і ацэнкай мастацкіх твораў, аналітычныя і сінтэзуючыя ўменні [2, с. 506].

Уменне аналізаваць мастацкі твор складаецца з сістэмы такіх уменняў як: уменне прайграць ваўяўленні карціны, якія адлюстраваў пісьменнік у сваім творы; уменне ўстанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі і паслядоўнасць выкладу зместу; уменне бачыць аўтарскую пазіцыю ва ўсіх кампанентах мастацкага твора; уменне разумець мастацкую ідэю твора і галоўную думку [3, с. 17].

На ўроках літаратурнага чытання значнае месца ў агульнай сістэме народнай педагогікі займае працоўнае выхаванне. Здаўна яно з’яўлялася важнай задачай бацькоў, а пасля і навучальных устаноў. Дзякуючы гэтаму ў народнай літаратуры, у апавяданнях і вершах беларускіх пісьменнікаў ўсхваляецца праца: *«Каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці», «Каб вады напіцца, трэба ёй пакланіцца», «Перш папрацуй, а тады і патанцуй», «Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы»*.

Разгадваючы беларускія загадкі, вучні развіваюць здольнасці да аналізу, абагульнення, фарміруюць уменне самастойна рабіць высновы, выдзяляць найбольш характэрныя і адметныя прыметы прадмета або з’явы: *«У чырвоных ботах ходзіць па балотах, захаваўшы лапкі, спрытна ловіць жабкі»*. Праз тэксты загадак вучні пазнаюць навакольны свет, знаёмяцца з рознымі рэчамі і

Репозиторий ГрГМУ

жывымі істотамі. Прастата і непасрэднасць такой народнай творчасці супадае з такімі ж асаблівасцямі дзіцячай псіхікі.

Такім чынам, чытанне з’яўляецца ўнікальным інструментам далучэння вучня да нацыянальных культурных традыцый. Фарміраванне культуры чытання лепш за ўсё пачынаць пры вывучэнні народных твораў, бо яны змяшчаюць вялікі патэнцыял для развіцця асобы вучня. Выкарыстоўваючы розныя прыёмы аналізу тэксту народных твораў, вучні на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі прывучаюцца ўважліва ставіцца да тэксту твора, звяртаць увагу на ўсе дэталі, якія адыгрываюць пэўную ролю ў развіцці сюжэту.

ЛІТАРАТУРА:

1. Фролова, Е. О воспитании любви к народному творчеству и родному слову / Е. Фролова // Народное образование. – 2000. – № 1 – С. 137 – 140.

2. Белорусская педагогическая энциклопедия: в 2 т. / редкол.: Г. Николаенко (отв. секр.) [и др.]. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2015. – Т.2 : Н – Я, 2015. – 726 с.

3. Оморокова, М. И. Совершенствование чтения младших школьников: Методическое пособие для учителя. 2-е изд., испр. и доп. / М. И. Оморокова – М.: АРКТИ, 2001. – 160 с.

## ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ З КАМПАНЕНТАМ “ГАЛАВА” Ў АСПЕКЦЕ ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА АПІСАННЯ

**Пяшко К. В.**

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт ім. А. С. Пушкіна
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Канцавая Г. М.

Фразеалагічныя адзінкі (ФА), адлюстроўваючы ў сваёй семантыцы працяглы працэс развіцця культуры народа, фіксуюць і перадаюць ад аднаго пакалення да другога культурныя ўстаноўкі і стэрэатыпы. З’яўляючыся неад’емнай часткай моўнай карціны свету, ФА заўсёды ўзнікаюць не столькі для таго, каб апісваць свет, колькі для таго, каб яго інтэрпрэтаваць. Менавіта гэта адрознівае фразеалагізмы ад іншых намінатыўных адзінак [1, с. 121-122]. В. М. Тэлія адзначае, што фразеалагічны склад мовы – гэта “люстэрка, у якім лінгвакультурная супольнасць ідэнтыфікуе сваю нацыянальную самасвядомасць”, менавіта фразеалагізмы як бы навязваюць носьбітам мовы асабліва бачанне свету, сітуацыі [2]. Напрыклад, звесткі пра побыт беларускага народа (чырвоны кут), пра этыкетныя паводзіны (садзіцца не ў свае сані, з пустымі рукамі, трымаць хвост трубою, абуваць у лапці), пра традыцыі і звычаі (як на Дзяды, вывесці на чыстую ваду).

Ва ўнутранай форме большасці фразеалагізмаў утрымліваюцца такія сэнсы, якія надаюць ім культурна-нацыянальны каларыт. Напрыклад,

Репозиторий ГГМУ